Яўген Рагін



...І па сёньня я страшэнна баюся
і партызанаў, і паліцаяў...

# Чалавек як знак прыпынку

***З нізкі “Абыпраштоські”***

Пераўтварыць ісьціну ў банальнасьць — плёвая справа, нават не ўспацееш. Па сутнасьці, усе мы толькі гэтым і займаемся...

Той, хто ў сьпякотны час невыноснага ліхалецьця наталіў смагу чыстай ды сьцюдзёнай вадою з крыніцы пад назовам Праўда, ніколі не пакаштуе перагнілай пратухлай жыжкі з застаялае багны пад назовам Хлусьня. Хіба што за вялікія грошы. Не, нават не за вялікія, а за вельмі вялізныя. Але, дзякаваць Богу, у жабрацкай нашай дзяржавы ня хопіць грошай, каб купіць тут УСІХ.

• • •

Адмысловая тэма для ўдумлівых і нетаропкіх развагаў: «Людзі як знакі прыпынку»! Аддаю задарма!

Ад шырыні душы і дзеля ўмацаваньня пачуцьця ўласнай сацыяльна-грамадскай значнасьці. Філолагі, філасафы і антраполагі, хапайце — не шкада! І матэрыялу наўкола — незлічона...

Вунь, гляньце, вось той, з трайным падбароддзем, дзяржаўным партфельчыкам у спатнелай руцэ і з пузам, як ночвы — шматзначнае і вельмі тлустае шматкроп'е. Усе туды, а ён — адтуль. Пыхкае, узмакрэлы, упарта цягне пусты скрыпучы воз уладных клопатаў, пакідаючы за сабой, як карова з пашы, сьвежае шматкроп'е нязьдзейсьненых учынкаў. Вось такое — **...**

А гэтая, маладзенькая нахаба, што звонкім дробам рассыпалася па прыступках пераходу і, як мара, зьнікла ў летняй прахалодзе падземкі! І толькі цокат абцасікаў, узмах спаднічкі, пах парфумы. Няўлоўная і заўжды гатовая на памылку. Як неўтаймаваная і вясёлая коска паміж простымі часткамі ў складаназлучаным сказе. Вось такая — **,**

А на гэтага зьвярніце ўвагу! У акулярах, зношаным пінжачку, з устойлівай тугой у вачах. Згорбіўся пасярод пляцу, задумаўся, бядак. Над чым? Над лёсам Беларусі? Не бяры ў галаву, ідзі дахаты! Не, стаіць. Укленчаны і здранцьвелы. Як безадказны пытальнік. Вось такі — **?**

Шмат іх наўкола, шмат — двухкосьсі, дужкі, апострафы, працяжнікі... І пасярод усёй гэтай пунктуацыйнай драбязы — толькі адзіны катэгарычны клічнік, вытыркнуты і саманадзейны, палітычна выверbegins і інтанацыйна завостраны, як задраная ўгару аглабля, як вельмі абнадзейваючы сімвал нашай нетутэйшай упартасьці і сусьветнай непераможнасьці. У ягоным цяньку прыемна папаліць. Палю і разважаю над чарговай надта цікавай тэмай: «Людзі як зьвяры»... Хто там рохкае за сьпінай?!

● ● ●

Яшчэ адна рысачка да абагульненага партрэта беларуса... Было гэта даўно. Калі жыцьцё здавалася бясконцым і бег прыносіў толькі радасьць, калі беларускую мову ў нашай «беларускай» школцы выкладалі па-руску, і Сож ня быў яшчэ такім мелкім. Жыў тады на суседняй веткаўскай вуліцы самы сапраўдны... паліцай. Ці ня дваццаць гадоў мінула з часу перамогі, а ён, адседзеўшы дзесьці за свой грэх, жыў сабе і жыў. І я гэтага дзіклівага сугнея-дзядзьку вельмі баяўся. Казалі, у яго ёсьць «вальтэр» і па начах (за брэжнеўскім надта застойным часам) ён па-ранейшаму трапна адстрэльвае самых лепшых раённых актывістаў і партыйцаў. Спагадлівая суседка, як магла, супакойвала мяне, саплівага. Маўляў, ніякі ён не забойца, а людзей у сваю паліцайскую маладосьць выратаваў ад фашыстаў болей, чым які-небудзь самы заўзяты партызан. Маўляў, сярод апошніх такія каты траляліся, што горш за фрыцаў былі. Карацей, проста не пашанцавала дзядзьку-сугнею.

Ледзь не звар'яцеў тады ад неразуменьня жыцьцёвыхісьцінаў. Здавалася б, просты падзел сьвету на «нашых» і «нянашых» запатрабаваў

неадкладнага перагляду. Да канца не разьбяруся з гэтым і па сёньня... У апошнюю вайну адна палова беларусаў пайшла ў партызаны, другая — у паліцаі. З дзьвюх бедаў — фашызм і савецкая ўлада — кожны па сваім разуменьні выбраў меншую. А сваёй долі ўрэшце не знайшоў ніхто. Так што не пашэнціла ні дзядзьку-сугнею з іржавым «вальтэрам» напагатове, ні Беларусі — краіне паўпрафесійных неспрактыкаваных здраднікаў.

І па сёньня я страшэнна баюся і партызанаў, і паліцаяў.

● ● ●

Ён прачынаўся з песьняй. Калі завіхаўся ў ваннай, успамінаў нешта з Багдановіча і яшчэ больш весялеў. Жыцьцесьцьвярджальна грымеў дзьвярыма прыбіральні. І на гэта былі, спадарове, падставы, былі. Цудоўны настрой, цудоўнае бясхмарнае надвор'е за вакном, цудоўныя жыцьцёвыя перспектывы! Цмокаў-жмакаў заспаную жонку, ускудлачваў валасы на галовах сыноў і бег на працу, радасна хапаючы чыстае паветра роднае Беларусі. Даруйце, ня бег. Не! Ніякай прыземленай зашмальцаванай прозы, толькі чыстага гатунку ўзьнёслая паэзія! Ня бег, а, распасьцёршы шыкоўныя белыя крылы, ляцеў-уздымаўся над усім гэтым беларускім харaством. Ляцеў, ціха радаваўся («Мая зямля, мой народ, мае мары і спадзяваньні!»), весела палохаў несанкцыянаваныя чародкі бесталковых бесклапотных галубоў і рашуча адганяў за межы гораду злавесныя чорныя і вельмі санкцыянаваныя зграі груганоў. І калі, выканаўшы свой пачэсны грамадскі абавязак, заходзіў на пасадку на паласу нацыянальнага аэрапорту «Мінск-2», яго чакалі з удзячнасьцю. «Як прайшоў палёт?»— хаваючы закаханы позірк, пыталася дзябёлая жанчына ў форменным сінім строі. «Як заўжды!»— бадзёра адказваў ён і сьпяшаў на працу ў бліжэйшую школку. Так, ён працаваў настаўнікам мовы, а па сумяшчальніцтве — анёлам-ахоўнікам усіх тых, хто любіў гэтую зямлю... Хто ж вінаваты, што гадоў колькі таму, уляцеўшы ў разьятраную нечаканую навальнічную хмару, ён ледзьве выжыў, зламаў правае крыло і назаўжды страціў анёльскую кваліфікацыю. Але ніхто гэтага нават і не заўважыў. Толькі дзябёлая жанчына ў сінім форменным строі дзесьці за горадам з тыдзень сыходзіла на плач... Лухта? Лухта!.. Толькі цяпер у сваёй школцы ён страшэнна шкадуе, што ўжо не прачынаецца, як калісь, з вясёлай песьняй...

А груганы над гарадской тэлевізійнай вышкай усё кружляюць ды кружляюць.

● ● ●

Постаці... Віця Шніп мажнейшы за Андрэя Федарэнку. «Субтильный» Федарэнка затое больш рослы і гонкі ў параўнаньні з каржакаватым Шніпом. Шніп ня паліць (кінуў!). А Федарэнка цыгарку з рота

не вымае. Шніп бегае піць гарбату ў кавярню, што побач з кінатэатрам «Мір». А вось Федарэнка раз-пораз наведвае «Бярозку», што на пляцы Перамогі; але вадкасьць, якую ён ужывае, сваім колерам гарбату чамусьці не нагадвае. Як я чуў ад дасьведчаных, у Шніпа ў кожным большменш прыстойным райцэнтры —дзяўчына, якая млее ад ягонага таленту (таму й не вылазіць той з правінцыі!). А Федарэнка (я проста перакананы!) любіць толькі родную жонку, а ўсіх сустрэчных за кіламетр абыходзіць. Федарэнка шалее ад Акуджавы і Зошчанкі. Шніп — ад уласных радкоў. З Федарэнкам мы разам сьпяваем у ахвотку рэвалюцыйныя і іншыя някепскія песьні. Шніп мармыча пад нос і ў адзіноце штосьці сваё. Андрэй — неўтаймаваны барацьбіт з уласным «Я». Віця — хутаранін: ні з кім не змагаецца, але й свайго за так не аддасьць. Федарэнка — палымянскі загадчык. Шніп — лімаўскі намесьнік. Федарэнка піша прозу. Шніп — вершы.

Ніяк не магу зразумець, хто з іх лепшы. Пайду лепей пачытаю штонебудзь з Алеся Наварыча.

• • •

Я калі-небудзь больш дэталёва паспрабую разабрацца ў анатоміі беларускай лаянкі, самай зьедлівай з якой лічыцца, бадай, вось гэтая: «Ды ідзіце вы ўсе ў с...!» А пакуль толькі дробненькі нюансік.

Састарэлы сусед, намуліўшы лоб ад вышпурваньня праўды з савецкіх чынавенскіх сьценаў, усё жыцьцё крычаў раздражнёна: «Куха-а-а-ркіны дзеці!» Змалку ня мог дацяміць, хто ж пакрыўдзіў дзядзьку-бамбізу, які выжыў у трох войнах і ў думках ня меў, каб заляцацца ды падлашчвацца да тых, хто кіраваў паціху людскімі паваеннымі лёсамі. А дарма, як паказаў час... Сусед, набіўшы пысы фінам, фрыцам і япончыкам, разгубіўся, як пачатковец, перад нейкім начфінам з сабезу, таму і карміўся да апошняга дня з мізэрнай пенсіі. З маленства я шкадаваў ня толькі няўдачлівага дзядзьку, але і тую невядомую кухарку, якой чамусьці, мяркуючы па суседавых інтанацыях, так не пашанцавала з дзецьмі.

Гэта пазьней ужо, кансьпектуючы пад прымусам і без стомы ленінскія працы і набраўшыся крыху розуму, зразумеў, пра якую кухарку гаворка. Пра тую, якая можа і павінна кіраваць нашай дзяржавай. І яна магла і кіравала ў адпаведнасьці з неўміручай і па сёньня марксісцкаленінскай тэорыяй савецкай абдзіралаўкі. Кіравала, ня ведаючы, што, як і да чаго. Кіравала, як мокрае гарыць. Культурай, навукай, сельскай гаспадаркай, падмяняючы адсутнасьць адукацыі паўнамоцтвамі, а сумленьне — партыйнай дысцыплінай. А калі сканала, цалкам выкарыстаўшы запас вар’яцкай і нічым не падмацаванай самаўпэўненасьці, пакінула пасьля сябе плойму сыноў-дачок-невукаў, гэткіх блізьнятаў з гнуткімі сьпінамі, пустымі вачмі і прагавітым, як і ў мамы, жаданьнем кіраваць: хлусіць і красьці.

І разьбегліся гэтыя жвавыя дзеткі па краіне і пачалі руйнаваць ня імі будаванае і нішчыць ня імі пасаджанае. І няма ад іх міру і па сёньня. Вось яны ідуць па нашых вуліцах і прасьпектах. Уладарнымі і шчыльнымі радамі, зладжана бразгаючы лыжкамі, міскамі і іншымі кухоннымі прыладамі, выціраючы з ілбоў пот кухонных шчыраваньняў.

Як і састарэлы сусед, хаваюся ў бліжэйшую арку. Затапчы вас камар, куха-а-а-ркіны дзеці!

• • •

Вось японцы — разумныя людзі. Ніколі ня кажуць «не». Хітраваны азіяцкія! Заўжды: «так, але...» А калі што ім насуперак — адразу харакіры, каб гонар ня страціць. Самурай на самураі... Плюнулі на Курылы. Пашыраюць свае астравы за кошт намыўнога марскога пяску. Самадастатковыя, словам.

Нябрыдкія таксама і французы. Адэкалон, кветкі, гальштук, палітэсы, у жаночую ручку — цмок. «Мерсі», маўляў. А калі што ня так, не па-французску — пальчатку ў твар. Маўляў, сатысфакцыя. Неадкладная і рашучая, як французская рэвалюцыя. З гэткімі ж надта маштабнымі вынікамі.

І ў амерыканцаў ніякіх праблемаў. Абгарнуліся паласата-зоркавым сьцягам, ногі — на стол, рукі — на пуза і, пыхкаючы цыгарай, праз зубы ў сьвет: «Як вас там? У чаргу! А перад тым, як у НАТА ўступаць, шыю, небаракі, адмыйце!» Згодны я! Свабода — рэч небясьпечная, але толькі яна гарантуе бясьпеку. Малайчыны, карацей.

Нас, беларусаў, быццам, таксама не ўказальным пальцам рабілі (хоць і не памятаем збольшага, калі і хто). І ў нас жа, спадарове, таксама свой шлях. Пуп Еўропы мы! Ну, не галава ж, вядома, ці іншае што-небудзь, але таксама, «меджду протчым», важны орган. Усім даводзім, а ніхто, халера, пакуль ня верыць. А мы рвемся сабе па крывавых разорах басанож, новыя боты да кійка цераз плячо падвязаўшы, згрувашчваемся нязграбным натоўпам ля мяжы, супраць сонейка з-пад рукі з запабачаньнем на Захад углядаемся: «Рэбята, а можа наце і нашыя штаны ў вашае жлукта?!» А тыя сьмяюцца. Што такое «жлукта», ня ведаюць. І хто б ім, несур’ёзным, растлумачыў?